Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 245 (314)
АЎТОРАК
22
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАВЕСЦІ ГЛЫБОКУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ РАБОТУ Ў МАСАХ

Усё шырэй і шырэй разгортваецца ў нашай області кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Створаны выбарчыя акругі, арганізуюцца выбарчыя камісіі, складаюцца спіскі выбаршчыкаў. На выбарчых участках тысячы агітатараў пачалі работу па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах.

Ва ўсёй рабоце па падрыхтоўцы да выбараў, як і ў астатнім жыцці нашай радзімы, вядучае, кіруючае месца займаюць партыйныя арганізацыі. З'яўляючыся кіруючым ядром усіх арганізацый працоўных як грамадскіх, так і дзяржаўных, яны і ў дні гэтай кампаніі мабілізоўваюць усе свае сілы на далейшае згуртаванне працоўных мас вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Да практычнай работы ў падрыхтоўцы да выбараў партыйныя арганізацыі прыступілі на месцах адразу пасля апублікавання Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР.

У пярвічнай партыйнай арганізацыі беластоцкага тэкстыльнага камбіната № 2 за прайшоўшы тыдзень праведзена вялікая арганізацыйная работа. На нарадах агітатараў, членаў рэдкалегій, комсамольскага і профсаюзнага актыва комуністы партарганізацыі растлумачылі задачы выбарчай кампаніі. Перагледжан састаў агітатараў, да агітацыйнай работы прыцягнуты новыя сілы з ліку лепшых рабочых і работніц. Апрача 30 раней вызначаных агітатараў на выбарчы ўчастак № 10, які замацаван за камбінатам, пасылаецца 60 новых агітатараў. Зараз з імі праводзяцца заняткі па азнаямленню з выбарчым законам. Пачаў работу пры камбінаце стол даведак і кансультацый. Кіраўнікі яго — комуністы тт. Буйло і Траўкіна ў нерабочыя гадзіны даюць выбаршчыкам падрабязныя адказы—аб парадку стварэння выбарчых камісій, аб тым, якія вуліцы адносяцца да той ці іншай акругі па выбарах у абласны совет і т. д.

Такі-ж малюнак мы бачым і на беластоцкай плюшавай фабрыцы. Адначасова з правядзеннем мітынгаў рабочых па цэхах, партарганізацыяй паладжана чытка газет у час перапынкаў і пасля работы. Агітатары тт. Елін, Буланава і іншыя прыступілі да вывучэння з рабочымі Палажэння аб выбарах. Трохдзённым семінарам ахоплены ўсе 30 агітатараў. Ад партыйнай, профсаюзнай арганізацый фабрыкі ў састаў выбарчых камісій вылучана 55 чалавек.

Вялікая работа ў пярвічных партарганізацыях разгарнулася ва ўсіх гарадах і раёнах області.

Гаркомы і райкомы КП(б)Б правялі інструктыўныя нарады сакратароў пярвічных партарганізацый. У сельсоветы і вёскі райкомамі накіраваны для дапамогі пярвічным партарганізацыям і сельсоветам у правядзенні выбарчай кампаніі комуністы—адказныя раённыя работнікі. У Парэцкім раёне ў вёскі выехалі 40 чалавек з ліку раённага актыва, у Аўгустоўскім — 25 чал. і т. д. Па 21 раёну області накіравана ў вёскі 651 раённы работнік.

Масава-палітычная работа па месцах, уся работа па кіраўніцтву выбарчай кампаніяй праводзіцца пад знакам мабілізацыі мас на яшчэ больш ўздым прадукцыйнасці працы, на хутчэйшае завяршэнне сельскагаспадарчых работ і поўнае выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай. Ужо ў першыя дні выбарчай кампаніі выканан план паставак Аўгустоўскім сельсоветам, Аўгустоўскага раёна. У Марцінканскім і Рудніцкім сельсоветах Парэцкага раёна набліжаюцца да завяршэння бульба-паставак.

З усёй сур'ёзнасцю ўключыліся ў выбарчую кампанію і разгарнулі велізарную работу партыйныя арганізацыі Беластока, Гродна, Ломжынскага, Лапскага і іншых раёнаў.

Бюро абласнога камітэта КП(б)Б у прынятым 18 кастрычніка рашэнні, змест якога друкуецца сёння ў нашай газеце, вызначыла канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў у абласны, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных. У гэтым рашэнні падкрэслена, што прадстаячыя выбары з'яўляюцца важнейшай палітычнай кампаніяй, важнейшай справай усіх партыйных, комсамольскіх, совецкіх і грамадскіх арганізацый.

Выбары ў мясцовыя Советы адбудуцца ў нашай області ўпершыню, па свайму размаху яны з'явяцца больш складанымі, чым выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР, бо прадстаіць выбранне вялікай колькасці дэпутатаў. Толькі ў абласны і Беластоцкі гарадскі советы дэпутатаў працоўных трэба будзе выбраць 339 дэпутатаў. Вось чаму партыйным арганізацыям трэба як мага лепш арганізаваць сваю работу, каб дабіцца паголоўнага ўдзелу ў выбарах усіх выбаршчыкаў, каб дабіцца выбрання ў мясцовыя Советы толькі лепшых з лепшых, правераных на справе людзей, сапраўдных прадстаўнікоў вызваленага народа — партыйных і непартыйных большэвікоў, актыўных барацьбітоў за справу Леніна-Сталіна.

Партыйныя арганізацыі разам са сваім беспартыйным актывам павінны быць пільнымі і даваць самы рашучы адпор вылазкам класавых ворагаў.

Комсамол нашай області на аснове рашэнняў XI Пленума ЦК ВЛКСМ і XIV з'езда ЛКСМБ аб палітычна-выхаваўчай рабоце сярод моладзі можа і павінен аказаць дапамогу ў агітацыйнай рабоце. Усе члены ленінска-сталінскага комсамола павінны выйсці на выбарчыя ўчасткі! У ліку першых павінны быць комсамольцы і па сустрэчы дня выбараў вытворчымі падарункамі.

Асаблівя вялікія задачы стаяць перад профсаюзнымі арганізацыямі. Фабрычна-заводскія камітэты, мясцкомы і ўвесь профсаюзны актыў пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый павінны ўсебакова растлумачваць выбаршчыкам Палажэнне аб выбарах і Сталінскую Канстытуцыю, павінны дабіцца паляпшэння ўсёй профсаюзнай работы.

Сотні актывістаў пасылаюць з ліку свайго актыва на выбарчыя ўчасткі арганізацыі МОПР'а, Асоавіяхіма і Чырвонага Крыжа. Партыйным арганізацыям неабходна ўзначаліць работу гэтых арганізацый.

У кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР комуністы нашай області правялі выключна вялікую работу. Яны згуртавалі вакол сябе ўсіх працоўных і дабіліся велізарных поспехаў пры галасаванні. Няма сумнення, што партыйныя арганізацыі нашай області, паўсядзённа ўмацоўваючы сувязь з масамі, своечасова адклікаючыся на запытанні і патрэбы працоўных, даб'юцца яшчэ большых поспехаў у прадстаячых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.



Мітынг на 2-м беластоцкім тэкстыльным камбінаце, прысвечаны пачатку выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Выступае стаханавец аддзелачнага цэха І. А. Маславіцкі.

Фота А. Сапіра. Фотахроніка БЕЛТА.

Агітатары выйшлі на ўчасткі

САКОЛКА. (По тэлефону). У Саколцы па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных створана тры выбарчыя акругі і па выбарах у раённы совет — 48 акруг.

У горадзе і раёне праведзены мітынгі і сходы, прысвечаныя пачатку выбарчай кампаніі, на якіх прысутнічала больш 17 тысяч чалавек.

У раённым выканаўчым камітэце складзен план работы, па якому праводзіцца агітацыйная работа.

Увесь актыў агітатараў, чытчыкаў і бяседчыкаў уключыўся ў агітацыйна-масавую работу. На прадпрыемствах, ва ўстановах і вёсках пачалі вылучаць лепшых людзей у выбарчыя камісіі.

Выбарчыя камісіі прыступаюць да работы

СНЯДАВА. (По тэлефону). У раёне заканчваюцца арганізацыйныя работы па падрыхтоўцы да выбараў. Створаны выбарчыя камісіі акругоў і ўчасткаў. У камісіі ўваходзіць больш 2.000 чалавек лепшых прадстаўнікоў ад рабочых, сялян і інтэлігенцыі. Камісіі прыступаюць да ажыццяўлення сваіх функцый.

Пры райкоме партыі адбылася нарада агітатараў. Агітатары на месцах прыступілі да агітацыйнай работы. З насельніцтвам вывучаецца Канстытуцыя і Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Сельскія советы вядуць падрыхтоўчую работу да складання спісаў выбаршчыкаў.

Вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю

ГРОДНА. (Ад нашага карэспандэнта). 16 кастрычніка бюро Гродненскага гаркома партыі абмеркавала пытанне аб разгортванні агітацыйна-масавай работы ў сувязі з прадстаячымі выбарамі.

Вялікую агітацыйную работу сярод выбаршчыкаў праводзіць парткабінет. Тут без адрыву ад вытворчасці арганізоўваюцца пяцідзённыя курсы агітатараў. Праз іх мяркуецца прапусціць 80 чалавек. Наладжваецца выстаўка, якая адлюструе выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На ўвесь перыяд выбараў наладжваецца пастаянная кансультацыя. Прапагандысты, агітатары і выбаршчыкі змогуць у любы час атрымаць адказы на цікавячыя іх пытанні.

26 кастрычніка намечана правесці семінар рэдактараў і членаў рэдкалегій насценных газет прадпрыемстваў і ўстаноў аб задачах нізавога друку ў выбарчай кампаніі.

На прадстаячай нарадзе кіраўнікоў турткоў мастацкай самадзейнасці абмяркуюцца пытанні культурнага абслугоўвання выбаршчыкаў. На былых выбарчых участках і сярод хатніх гаспадынь праводзяцца сходы. Наладжана работа па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі.

ВЫТВОРЧЫМІ ПАДАРУНКАМІ РАДЗІМЕ СУСТРЭНЕМ XXIII ГАДАВІНУ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Шырока разгортваюць спаборніцтва

На Ломжынскім заводзе сельскагаспадарчых машын усё шырэй разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу ўсенароднага свята — XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Рабочыя зборачнага цэха абавязаліся вытворчую праграму па выпуску конных прыводаў выканаць у кастрычніку на 110 процантаў, поўнасцю ліквідаваць брак.

Не так даўно гэты цэх быў вузкім месцам на заводзе. Працавала дзве брыгады па 7—8 чалавек і план выконвалі толькі на 60 — 70 процантаў. Зараз у ім працуе 6 брыгад на 2—3 чалавекі і значна павысілі сваю прадукцыйнасць працы. Уперадзе ідзе брыгада тав. Арлоўскага.

Рабочыя заключылі індывідуальныя соцыялістычныя дагаворы. Стаханаўцы ліцейнага цэха сістэматычна выконваюць план на 140 — 150 процантаў. Старшыня заўкома Леон Найваркоўскі і Іпаліт Кандзерскі ўзяліся зафармаваць і адліць дэталь складанай канфігурацыі вагой у 1.100 кілаграмаў. Такой работы на заводзе з моманту яго існавання ніколі не вытваралася.

На заводзе праведзены цэхавыя вытворчыя нарады, на якіх былі ўскрыты прычыны, што тармозяць выкананне соцыялістычных абавязацельстваў, і прыняты меры да ліквідацыі гэтых перашкод. Напрыклад, заменена ручное свідраванне машынным, праведзен падзел працы на працу асноўную і дапаможную.

Калектыў завода прымае ўсе меры, каб датэрмінова выканаць гадавую праграму па якасці і колькасці, каб сустрэць вялікае свята новымі вытворчымі падарункамі.

С. Якавіцкі.

ВЫКОНВАЮЦЬ УЗЯТЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

ГРОДНА. (Ад нашага карэспандэнта). Абмеркаваўшы пытанне аб дастойнай сустрэчы слаўнай гадавіны — вялікага Кастрычніка, калектыў гродненскага скурзавода № 5 узяў на сябе абавязацельства выканаць гадавую вытворчую праграму да 1 снежня. Рабочыя абавязаліся даць краіне 14 мільёнаў дэцыметраў хрому, асвоіць выраб свіных скур, павысіць сортнасць вырабу скур на 4 проценты.

Паклаўшы ў аснову сваёй работы Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, калектыў з чэсцю выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы. Спаборнічаючыя паміж сабой брыгады штодзённа выконваюць і перавыконваюць свой план. Брыгада зольшчыкаў (брыгадзір тав. Барадзюк) кожны дзень выконвае сваю норму на 200 процантаў, брыгада шпальтаўшчыкаў (брыгадзір тав. Шэін) выконвае заданне на 150 процантаў. Сортнасць вырабаў замест дапускаемых па норме 70 процантаў даведзена да 74 проц.

Паўнацэнны працадзень

ГРАЕВА. (Ад нашага карэспандэнта). Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна, Граеўскага раёна, рыхтуюць дастойную сустрэчу XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Калгас поўнасцю выканаў абавязацельствы перад дзяржавай па здачы сельскагаспадарчых прадуктаў.

На калгасных палях вырашчан высокі ўраджай зерневых і бульбы. Сярэдні ўраджай зерневых складае 13 цэнтнераў з гектара, а бульбы—1000 пудоў. У калгасе рыхтуюцца да размеркавання даходаў. Падлічана, што на кожны працадзень у калгасе будзе 5 кілаграмаў зярна і 11 кілаграмаў бульбы. Сям'я былога беззямельнага селяніна Аляксандра Гурскага мае ўжо больш 500 працадзён. Пры канчатковым размеркаванні яна атрымае 2.500 кілаграмаў хлеба, 5.500 кілаграмаў бульбы.

Калгаснікі клапоцяцца аб будучым ураджаі. Поўнасцю закончана ворыва зяблiва. На большую частку плошчы ўнесены мінеральныя ўгнаенні.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
аб парадку абавязковага пераводу інжынераў, тэхнікаў, майстраў, служачых і кваліфікаваных рабочых з адных прадпрыемстваў у іншыя.

Задача забеспячэння кваліфікаванымі кадрамі новых заводаў, фабрык, шахт, руднікоў, будоўляў, транспарта, а таксама прадпрыемстваў, якія пераходзяць на вытворчасць новых відаў прадукцыі,—патрабуе правільнага размяшчэння інжынераў, тэхнікаў, майстраў, служачых, кваліфікаваных рабочых паміж асобнымі прадпрыемствамі і пераводу работнікаў прамысловасці з адных прадпрыемстваў, якія маюць у сваім распараджэнні кваліфікаваныя кадры, на іншыя прадпрыемствы, якія адчуваюць у іх недахоп.

Існуючае палажэнне, пры якім наркаматы не маюць права накіроўваць інжынераў, служачых і кваліфікаваных рабочых у абавязковым парадку з аднаго прадпрыемства на другое,—з'яўляецца перашкодай для развіцця народнай гаспадаркі.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР **пастанаўляе:**

1. Прадаставіць народным камісарам Саюза ССР права пераводзіць у абавязковым парадку інжынераў, канструктараў, тэхнікаў, майстраў, чарцёжнікаў, бухгалтараў, эканамістаў, рахункова-фінансавых і планавых работнікаў, а таксама кваліфікаваных рабочых, пачынаючы з шостага разраду і вышэй, з адных прадпрыемстваў на іншыя, незалежна ад тэрытарыяльнага размяшчэння прадпрыемстваў і ўстаноў.

2. Перавод, у парадку гэтага Ўказа, інжынераў, служачых і кваліфікаваных рабочых на работу ў іншыя мясцовасці не павінен весці да якіх-небудзь матэрыяльных страт перавадзімага работніка, у сувязі з чым устанавіць, што наркамат абавязан выплачваць перавадзімаму работніку: а) кашто́ўнасць праезду да новага месца работы самога работніка і членаў яго сям'і; б) каштоўнасць правозу маёмасці; в) сутачныя за час знаходжання ў дарозе; г) заработную плату ў час знаходжання ў дарозе і дадаткова яшчэ за 6 дзён; д) аднача́совую дапамогу на ўпарадкаванне на новым месцы—у размеры ад 3-х да 4-х месячнай заработнай платы (у залежнасці ад раёна) па старому месцу работы па перавадзімага работніка і ў размеры 1/4 месячнай зарплаты перавадзімага работніка на кожнага члена сям'і ад'язджаючага на месца яго работы.

3. Устанавіць, што за інжынерамі, служачымі і кваліфікаванымі рабочымі, перавадзімымі з аднаго прадпрыемства на другое ў межах той-жа мясцовасці, захоўваецца бесперапыннасць працоўнага стажу на прадпрыемстве, а перавадзімым у іншыя мясцовасці—дадаткова прыбаўляецца адзін год працоўнага стажу.

4. Устанавіць, што дырэктары прадпрыемстваў і начальнікі ўстаноў абавязаны даваць дазвол на пакіданне прадпрыемства ці ўстановы жонкам інжынераў, служачых і кваліфікаваных рабочых, перавадзімых у іншую мясцовасць, згодна гэтага Ўказа.

5. Асобы, вінаватыя ў невыкананні загада Народнага Камісара аб абавязковым пераводзе на іншае прадпрыемства ці ўстанову, лічацца самавольна пакінуўшымі прадпрыемства ці ўстанову і аддаюцца суду па артыкулу 5 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў.

6. Адмяніць з 20 кастрычніка 1940 года працоўныя дагаворы, заключаныя на тэрмін наркаматамі і прадпрыемствамі з інжынерамі, служачымі і кваліфікаванымі рабочымі, пералічанымі ў артыкуле І гэтага Указа, і дазволіць народным камісарам Саюза ССР пакінуць указаных інжынераў, служачых і кваліфікаваных рабочых на тых прадпрыемствах, дзе яны працуюць па дагавору.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
19 кастрычніка 1940 г.

У абкоме КП(б)Б

18 кастрычніка бюро Беластоцкага абкома КП(б)Б прыняло пастанову аб падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у абласны, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных. Адзначыўшы, што пачаўшаяся выбарчая кампанія з'яўляецца важнейшай палітычнай кампаніяй, што правядзенне яе з'яўляецца важнейшай справай усіх партыйных, комсамольскіх, совецкіх і грамадскіх арганізацый, бюро абкома намеціла рад практычных мерапрыемстваў для паспяховага ажыццяўлення задач, пастаўленых перад партыйнымі арганізацыямі.

Бюро абкома прапанавала ўсім гаркомам і райкомам КП(б)Б не пазней 25 кастрычніка абмеркаваць на партыйных і комсамольскіх сходах, а ў Беластоку і Гродне — на сходах актыва, пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў у мясцовыя Советы, распрацаваўшы мерапрыемствы па канкрэтнаму правядзенню выбарчай кампаніі.

Адным з адказных этапаў выбарчай кампаніі з'яўляецца шырокае разгортванне растлумачальнай работы ў масах. Бюро абкома КП(б)Б абавязала сакратароў гаркомаў і райкомаў неадкладна прыступіць к падбору агітатараў і праводзіць з імі інструктыўныя заняткі ў агіткалектывах і семінарах, каб усе давераныя асобы і агітатары добра ведалі біяграфіі кандыдатаў у дэпутаты. Арганізаваць гурткі па вывучэнню Канстытуцыі СССР і БССР, а таксама Палажэння аб выбарах.

Цэнтрам агітацыйнай работы павінен стаць выбарчы ўчастак. Неабходна выкарыстаць усе формы масава-палітычнай работы, каб забяспечыць стопроцантную яўку выбаршчыкаў на выбары.

Партыйныя арганізацыі павінны шырока растлумачваць палітыку партыі, дасягненні працоўных СССР і нашай області да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, мабілізоўваць працоўных на паспяховае выкананне канкрэтных гаспадарча-палітычных задач, якія стаяць перад кожным горадам, раёнам, прадпрыемствам, вёскай. У агітацыйнай рабоце неабходна шырока выкарыстаць кіно, радыё, хаты-чытальні, клубы, насценны друк.

Бюро абкома абавязала рэдактараў абласных, раённых газет і кіраўнікоў радыёвяшчання забяспечыць шырокую папулярызацыю вылучаных кандыдатаў у дэпутаты і сістэматычна асвятляць ход падрыхтоўкі да выбараў.

З мэтай поўнага забеспячэння працоўных газетамі, плакатамі, журналамі і выбарчай літаратурай прапанавана аддзяленню Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі, аблспажыўсаюзу і абласному аддзяленню «Саюздруку» ажыццявіць у гэтым напрамку неабходныя мерапрыемствы, каб выбарчыя ўчасткі былі поўнасцю забяспечаны газетамі, журналамі, плакатамі і палітычнай літаратурай.

Бюро абавязала начальніка абласнога ўпраўлення сувязі максімальна радыёфіцыраваць і тэлефанізіраваць выбарчыя ўчасткі, забяспечыць бесперабойную работу сувязі ў області.

Паведамленне ТАСС

Амерыканскае агенцтва Юнайтэд Прэс, са спасылкай на свайго стамбульскага карэспандэнта, паведамляе, што «турэцкі пасол у Маскве Актай 18 кастрычніка меў сакрэтную гутарку з Сталіным».

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэта паведамленне Юнайтэд Прэс не адпавядае сапраўднасці.

РЭЗАЛЮЦЫЯ

XIV з'езда Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі па справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ

(Прынята аднагалосна)

Заслухаўшы і абмеркаваўшы справаздачны даклад сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Каралёва аб рабоце Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ, XIV з'езд Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі прызнае палітычную лінію ЦК ЛКСМБ правільнай і практычную работу здавальняючай.

Перыяд, прайшоўшы ад XIII да XIV з'езда ЛКСМБ, насычан падзеямі велізарнай палітычнай важнасці. Галоўнейшай з іх быў гістарычны XVIII з'езд Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў), які паставіў перад партыяй і ўсім савецкім народам задачу па завяршэнню будаўніцтва бяскласавага соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма.

Гэта перыяд усясветна-гістарычных перамог генеральнай лініі нашай партыі, таржаства мудрай сталінскай палітыкі міру, перыяд далейшага згуртавання многаміл'ённых мас працоўных нашай радзімы вакол большэвіцкай партыі і таварыша **Сталіна.**

Выконваючы гістарычныя рашэнні XVIII з'езда ВКП(б), вялікі савецкі народ паспяхова ажыццяўляе план Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі— рашаючага этапа ў выкананні пастаўленай таварышам Сталіным асноўнай эканамічнай задачы — дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах. Нязмерна вырасла абаронная магутнасць і міжнародны аўтарытэт нашай соцыялістычнай дзяржавы.

Дзякуючы поспехам міжнароднай і ўнутранай палітыкі Савецкай дзяржавы 23 мільёны працоўных Заходняй Беларусі і Украіны, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, Літвы, Латвіі і Эстоніі ўліліся ў дружную, шчаслівую сям'ю народаў Савецкага Саюза.

Гераічная Чырвоная Армія і Флот наталаву разграмілі фінскую белагвардзейшчыну, забяспечыўшы бяспечнасць паўночна-заходніх рубяжоў СССР і горада Леніна. Створана Саюзная Карэла-Фінская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка.

З'еднанне вялікага беларускага народа ў адзінай соцыялістычнай дзяржаве на аснове ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі ператварыла ордэнаносную Беларусь у рэспубліку з 10-мільённым насельніцтвам, якая прадстаўляе несакрушальны фарпост вялікай соцыялістычнай дзяржавы на рубяжах з капіталістычным захадам.

XVIII з'езд ВКП(б) паставіў перад комсамолам задачу больш актыўнага ўдзелу ў дзяржаўным і гаспадарчым будаўніцтве, яшчэ вышэй падняў яго ролю, як бліжэйшага памочніка і баявога рэзерва большэвіцкай партыі.

Выконваючы рашэнні XVIII з'езда ВКП(б) і XVIII з'езда КП(б)Б, комсамольская арганізацыя Беларусі пад кіраўніцтвам Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі дабілася значных поспехаў на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва і прышла да свайго XIV з'езда ідэйна і арганізацыйна ўмацаваўшайся, маналітнай, цесна згуртаванай вакол роднай большэвіцкай партыі і нашага вялікага правадыра таварыша **Сталіна.**

Вырасла палітычная і працоўная актыўнасць комсамольцаў і моладзі Беларусі. За справаздачны перыяд у рады комсамола Беларусі прынята 130.967 чалавек з ліку лепшай, перадавой часткі савецкай моладзі. Створана 5.039 пярвічных комсамольскіх арганізацый, з іх 1.957 калгасных.

14.950 лепшых комсамольцаў прынята ў партыю. 99 комсамольцаў рэспублікі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза за высокія паказчыкі соцыялістычнай працы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. 25 комсамольцаў выбраны дэпутатамі Вярхоўных Саветаў СССР і БССР. 9.996 комсамольцаў з'яўляюцца дэпутатамі мясцовых Саветаў.

У сувязі з выхадам у свет Сталінскага «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» і ў рэзультаце перабудовы прапаганды ў комсамоле на аснове пастановы ЦК ВКП(б) ад 14 лістапада 1938 года значна палепшылася палітычнае выхаванне комсамольцаў. Больш 63 тысяч комсамольцаў у рэспубліцы самастойна працуюць над кнігай, паспяхова авалодваюць маркісцка-ленінскай тэорыяй.

Комсамольскія арганізацыі Беларусі правялі вялікую агітацыйна-масавую работу ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Агітатарамі і членамі выбарчых камісій працавала звыш 60 тысяч комсамольцаў, 10 тысяч комсамольцаў і моладзі праводзілі агітацыйную работу ў час выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР ад заходніх абласцей Беларусі.

Большэвіцкая ідэйная і практычная загартоўка комсамольскага актыва забяспечыла колькасны і якасны рост кіруючых комсамольскіх кадраў. На кіруючую комсамольскую работу за справаздачны перыяд вылучана 9.869 комсамольцаў, 6.257 комсамольцаў пасланы на работу ў заходнія абласці БССР.

Пасля рашэнняў X пленума ЦК ВЛКСМ комсамольскія арганізацыі нашай рэспублікі сталі сур'ёзней займацца работай школ. Многія з іх устанавілі дзелавую сувязь з настаўніцтвам і дабіліся значных поспехаў у вучэбна-выхаваўчай рабоце. Падрыхтоўка і правядзенне алімпіяд дзіцячай творчасці, у якіх удзельнічала 304.700 школьнікаў, мабілізавалі навучаючыхся на лепшую вучобу і дысцыпліну, з'явіліся стымулам да развіцця мастацкай самадзейнасці.

Змястоўней і цікавей у радзе школ пачалі працаваць піонерскія атрады. 450 комсамольцаў-настаўнікаў вылучаны на работу старшымі важатымі.

Комсамольскія арганізацыі пачалі больш удзяляць увагі абаронна-фізкультурнай рабоце, асоавіяхімаўскім і фізкультурным арганізацыям. У 1940 годзе 30 тысяч комсамольцаў авалодалі ваеннымі спецыяльнасцямі. Сярод навучаючыхся аэраклубаў — 75 процантаў комсамольцаў. Комсамольскія арганізацыі прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні прызыва ў рады Чырвонай Арміі і Флота.

Выбары кіруючых комсамольскіх органаў прайшлі на высокім ідэйна-палітычным узроўні пры актыўным удзеле мас комсамольцаў. У рэзультаце выбараў да кіраўніцтва комсамольскімі арганізацыямі прышлі новыя слаі актыва, беззаветна аддана га партыі Леніна — Сталіна, праявіўшага сябе на практычнай рабоце.

XIV з'езд комсамола Беларусі адзначае, што ў рабоце комсамольскай арганізацыі рэспублікі ёсць і сур'ёзныя недахопы.

Значная частка комсамольскіх арганізацый яшчэ слаба ўнікае ў дзейнасць прадпрыемстваў, калгасаў, соўгасаў, МТС і ўстаноў, не аказвае партыйнаму і гаспадарчаму кіраўніцтву неабходнай дапамогі ў справе выканання задач, пастаўленых партыяй і ўрадам.

Комсамольскія арганізацыі нездавальняюча працуюць па раз'ясненню і практычнаму выкананню Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня 1940 г., не вядуць рашучай барацьбы з дэзарганізатарамі вытворчасці, парушальнікамі працоўнай і дзяржаўнай дысцыпліны, бракаробамі, падрываючымі інтарэсы соцыялістычнай дзяржавы. Вытворчыя комсамольскія арганізацыі мала клапоцяцца аб памнажэнні радоў і выхаванні маладых стаханаўцаў, не надаюць належнага значэння тэхнічнай вучобе комсамольцаў і моладзі.

З'езд адзначае недастатковую ўвагу комсамольскіх арганізацый справе ўздыму ўраджайнасці і развіцця грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах. Многія комсамольскія арганізацыі не вялі сапраўднай барацьбы за павышэнне прадуктыўнасці жывёлы і расшырэнне моцнай кармовай базы. З 57 тысяч комсамольцаў, якія працуюць у сельскай гаспадарцы, у галіне жывёлагадоўлі працуюць усяго 3,5 тысячы комсамольцаў.

Марудна і нерашуча выконваюцца рашэнні XI пленума ЦК ВЛКСМ. Пастаянныя камісіі, створаныя пры гаркомах і райкомах комсамола, не разгарнулі яшчэ па-сапраўднаму сваю работу, не сталі на справе пастаяннымі органамі райкомаў па кіраўніцтву і аказанню дапамогі пярвічным комсамольскім арганізацыям. Многія раённыя камітэты комсамола самаўхіліліся ад кіраўніцтва камісіямі, абмежаваліся падборам людзей і да гэтага часу недастаткова прыцягваюць актыў да кіраўніцтва пярвічнымі комсамольскімі арганізацыямі.

Рэспубліканскія комсамольскія газеты «Чырвоная змена» і «Сталинская молодежь» нездавальняюча асвятляюць пытанні перабудовы арганізацыйнай работы комсамола, у прыватнасці вопыт работы перадавых райкомаў, камісій, інструктараў райкомаў, што з'яўляецца прамым вынікам недастатковай сувязі гэтых газет з комсамольскім актывам, слаба прыцягваемым да работы друку.

Сур'ёзнейшым недахопам у рабоце комсамольскіх арганізацый з'яўляецца тое, што ЦК ЛКСМБ, абласныя, гарадскія і раённыя камітэты комсамола не вялі большэвіцкай барацьбы за выкананне сваіх рашэнняў і рашэнняў вышэйстаячых камітэтаў, што прывяло да зніжэння адказнасці ў рабоце значнай часткі кіруючага комсамольскага актыва і нізкай дысцыпліны ў радзе пярвічных комсамольскіх арганізацый рэспублікі.

Абласныя і раённыя камітэты комсамола не надалі палітычнага значэння пытанню своечасовай уплаты членскіх узносаў комсамольцамі. Адсутнасць кантролю за правільнасцю ўплаты ўзносаў, безадказныя адносіны да выканання гэтага важнейшага статутнага абавязку комсамольцаў прывяло да таго, што толькі ў адной Віцебскай вобласці 12.308 комсамольцаў не плацілі членскіх узносаў на працягу аднаго і больш месяцаў.

Раённыя камітэты ЛКСМБ зусім недастаткова ўдзялялі ўвагі якаснаму ўмацаванню радоў ВЛКСМ, дапусціўшы рад парушэнняў ленінска-сталінскага прынцыпа індывідуальнага адбору пры прыёме ў комсамол. Асобныя райкомы фармальна падыходзілі да прыёму, прымалі ў члены ВЛКСМ людзей, недастаткова палітычна падрыхтаваных, незнаёмых са статутам і праграмай комсамола, часам не правераных і нічым не апраўдаўшых сябе на практычнай рабоце (Магілеў РК, Кірава, Бешанковічы, Орша РК і др.). Раённыя камітэты і пярвічныя комсамольскія арганізацыі да гэтага часу слаба вядуць выхаваўчую работу з новапрынятымі ў комсамол, мала ўцягваюць іх у актыўную работу.

З'езд асобна адзначае нездавальняючае кіраўніцтва гаркомаў і райкомаў комсамола малалікімі комсамольскімі арганізацыямі.

У рэзультаце адсутнасці паўсядзённага кіраўніцтва і кантроля з боку абкомаў, гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ у справе палітычнай самаадукацыі, значная частка комсамольскага актыва яшчэ не прыступіла да глыбокага вывучэння гісторыі ВКП(б), у гуртках яшчэ не ліквідавана так званая «сезоннасць» і метады школярскай зуброжкі і начотніцтва.

З'езд падкрэслівае, што комсамольскія арганізацыі мала займаюцца вырошчваннем лектарскіх кадраў з ліку комсамольскага актыва і лепшай часткі савецкай інтэлігенцыі. Не наладжаны платныя лекцыі для комсамольскага актыва.

Павярхоўныя, а часта і пагардлівыя адносіны многіх комсамольскіх арганізацый і адрыў ад дзеласці народнай асветы да работы школ і выхавання школьнікаў прывялі да таго, што паспяховасць вучняў за прайшоўшы вучэбны год яшчэ вельмі нізкая— 81,5 проц.

XIV з'езд адзначае, што большасць комсамольскіх арганізацый нездавальняюча выконвае рашэнні IX пленума ЦК ВЛКСМ. Абаронна-фізкультурная работа не стала яшчэ ў цэнтры ўвагі пярвічных арганізацый. Толькі 45 проц. комсамольцаў рэспублікі з'яўляюцца членамі Асоавіяхіма, 28 проц. комсамольцаў займаюцца фізкультурай. Вельмі слаба вядзецца абаронна-фізкультурная работа сярод калгаснай моладзі. У 8.500 калгасах няма фізкультурных арганізацый. Комсамольскія арганізацыі Гомельскай і Магілеўскай абласцей недастаткова вядуць работу з прызыўнікамі і дапрызыўнікамі, не арганізоўваюць сярод іх падрыхтоўкі і здачы норм на абаронныя значкі, не дапамагаюць ім авалодваць асновамі ваеннай справы.

З'езд адзначае, што комсамольскія арганізацыі заходніх абласцей БССР слаба разгортваюць масава-палітычную работу сярод моладзі, не ўлічваюць мясцовых асаблівасцей. Праводзімая імі масава-палітычная работа не з'яўляецца сістэматычнай і дастаткова глыбокай.

XIV з'езд Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі **пастанаўляе:**

Ва ўсёй далейшай рабоце Цэнтральнаму Камітэту, абкомам, гаркомам, райкомам і ўсім пярвічным арганізацыям Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі кіравацца рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б) і XVIII з'езда КП(б)Б, мабілізуючы ўсіх комсамольцаў і моладзь на выкананне гэтых гістарычных рашэнняў.

XIV з'езд комсамола Беларусі абавязвае ўсе комсамольскія арганізацыі забяспечыць няўхільнае выкананне Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года, рашуча змагацца з дэзарганізатарамі вытворчасці, раскрадальнікамі соцыялістычнай уласнасці, бракаробамі, поўнасцю ліквідаваць прагулы і прастоі, паўсядзённа ўмацоўваць дзяржаўную і комсамольскую дысцыпліну, забяспечыць далейшы ўздым стаханаўскага руху сярод комсамольцаў і моладзі рэспублікі.

Па выкананню Ўказа павінна ацэньвацца становішча дысцыпліны і ўсёй работы ў комсамольскіх арганізацыях. Адносіны да соцыялістычнай працы павінны быць пакладзены ў аснову ацэнкі маральных якасцей кожнага комсамольца, які павінен інтарэсы соцыялістычнай дзяржавы ставіць вышэй за ўсё.

З'езд звяртае ўвагу комсамольскіх арганізацый на неабходнасць правядзення сістэматычнай растлумачальнай работы вакол Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР».

З'езд патрабуе ад ЦК, абкомаў, гаркомаў, райкомаў ЛКСМБ і ўсіх комсамольскіх арганізацый аказаць дапамогу партыйным і савецкім арганізацыям у правядзенні мабілізацыі і добраахвотнага набору моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы, школы ФЗА, у пастаноўцы іх работы, у абсталяванні і добрабыце.

З'езд лічыць неабходным у гарадах і раёнах, дзе будуць рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА, арганізаваць пастаянна дзейнічаючыя камісіі пры гаркомах і райкомах ЛКСМБ па рабоце сярод моладзі рамесленых і чыгуначных вучылішч і школ ФЗА.

Комсамольскім арганізацыям Беларускай, Заходняй, Брэсцкай і Беластоцкай чыгунак мабілізаваць комсамольцаў і моладзь на паляпшэнне якасных вытворчых паказчыкаў, забяспечыць вядучую ролю комсамольскіх брыгад у барацьбе за выкананне дзяржаўнага плана перавозак, весці барацьбу за выкананне плана абароту вагонаў, барацьбу з прастоямі і спазненнямі паяздоў, з крушэннямі, аварыямі, з раскрадваннем чыгуначнай маёмасці і грузаў.

Абавязаць тэрытарыяльныя комсамольскія арганізацыі аказваць паўсядзённую практычную дапамогу комсамольскім арганізацыям чыгуначнага і воднага транспарта ў разгортванні палітыка-выхаваўчай работы сярод комсамольцаў і моладзі.

Комсамольскія арганізацыі абавязаны аказваць дзейсную дапамогу партыйным і савецкім органам у выкананні рашэнняў Майскага пленума ЦК ВКП(б), рашуча змагацца супроць парушальнікаў статута сельгасарцелі, ілжэкалгаснікаў, дэзарганізатараў калгаснай вытворчасці і раскрадальнікаў калгаснай маёмасці.

Комсамольцы вёскі павінны ўзначаліць барацьбу за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны і зберажэнне соцыялістычнай уласнасці, за павышэнне прадукцыйнасці працы шляхам расшырэння соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху, шляхам умацавання калгасных брыгад, звенняў, унядрэння індывідуальнай здзельшчыны. Комсамольцы павінны выступіць застрэльшчыкамі барацьбы за 100-пудовы ўраджай зерневых з гектара.

Комсамольскія арганізацыі шырэй павінны праяўляць ініцыятыву і падтрымліваць народны рух па правядзенню добраўпарадкавання калгаснай вёскі: будаўніцтву вадаёмаў, калодзежаў, насаджэнню пладовых дрэў, будаўніцтву і рамонту дарог, насаджэнню новых і прывядзенню ў парадак паяўных калгасных паркаў і месц адпачынку, дабіваючыся таго, каб кожнае калгаснае сяло мела прыгожы і культурны выгляд. Комсамольскія арганізацыі абавязаны прыняць актыўны ўдзел у далейшым развіцці меліярацыйнага будаўніцтва, дабіваючыся ператварэння асушаных балот у высокаўраджайныя калгасныя палі.

Надаючы вялікае народна-гаспадарчае значэнне ўнядрэнню каучуканоснай культуры кок-сагыза, з'езд абавязвае комсамольскія арганізацыі аказваць усямерную дапамогу зямельным органам і калгасам у выкананні плана пасеву і забеспячэнні высокага ўраджаю кок-сагыза.

ЦК, абкомам, райкомам комсамола Беларусі забяспечыць актыўны ўдзел комсамольскіх арганізацый у рэалізацыі рашэнняў ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерапрыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах», накіраваць лепшых комсамольцаў для работы ў галіне жывёлагадоўлі. Комсамольцы сяла павінны аказваць дапамогу праўленням калгасаў у стварэнні і ўкамплектаванні жывёлагадоўчых ферм, павышэнні прадуктыўнасці і пародзістасці жывёлы, вырошчванні маладняка, правільнай арганізацыі працы на жывёлагадоўчых фермах, ва ўцяпленні скотных двароў.

З'езд абавязвае абкомы, райкомы ЛКСМБ і пярвічныя арганізацыі навесці рашучую барацьбу з пагардлівымі адносінамі да развіцця конегадоўлі, пакончыць з безгаспадарчасцю і абязлічкай у выкарыстанні каня на рабоце, звярнуўшы асаблівую ўвагу на падрыхтоўку каня для РСЧА. Адной з важнейшых задач комсамольскіх арганізацый вёскі з'яўляецца расшырэнне і паляпшэнне кармавой базы соцыялістычнай жывёлагадоўлі рэспублікі, барацьба за выкананне планаў сіласавання, расшырэнне пасеваў кармавых траў і беражлівае расходаванне кармоў.

З'езд патрабуе ад усіх комсамольскіх арганізацый рашуча палепшыць справу падрыхтоўкі механізатарскіх кадраў сельскай гаспадаркі і жанчын-трактарыстак.

Комсамольцы павінны падаваць асабісты прыклад стаханаўскай працы на калгаснай вытворчасці і першачарговага выканання ўсіх абавязацельстваў перад соцыялістычнай дзяржавай.

З'езд падкрэслівае, што галоўнай з задач, якія стаяць перад комсамолам, з'яўляецца выхаванне ўсіх комсамольцаў і моладзі ў духу комунізма. Паспяховае ажыццяўленне гэтай задачы патрабуе, каб кіруючыя комсамольскія кадры самі ў першую чаргу сур'ёзна і глыбока авалодвалі маркісцка-ленінскай тэорыяй, расшыралі свае веды ў разнастайных галінах грамадска-палітычных навук, прыродазнаўства, літаратуры, мастацтва і т. д.

Цэнтральнаму камітэту, абкомам, гаркомам і райкомам ЛКСМБ рашуча палепшыць кіраўніцтва прапагандай у комсамольскіх арганізацыях рэспублікі і поўнасцю ліквідаваць самацёк у пастаноўцы самастойнага вывучэння гісторыі ВКП(б), узмацніць кантроль над палітычнай самаадукацыяй комсамольцаў.

Сакратарам абкомаў, гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ сістэматычна арганізоўваць індывідуальныя і групавыя гутаркі па тэарэтычных пытаннях з комсамольцамі, якія самастойна вывучаюць «Кароткі курс», паднімаць грамадскую думку ў друку і на комсамольскіх сходах супроць тых комсамольцаў, якія не працуюць над ліквідацыяй сваёй тэарэтычнай адсталасці. Дабіцца сур'ёзнага паляпшэння лекцыйнай работы, вырошчваючы актыў маладых лектарскіх кадраў.

Усім кіруючым комсамольскім работнікам сістэматычна выступаць з лекцыямі, дакладамі і гутаркамі сярод комсамольцаў і моладзі. Ліквідаваць кампанейшчыну ў агітацыйна-масавай рабоце, надаць агітацыі баявы, наступальны характар у барацьбе з перажыткамі капіталізма ў свядомасці людзей, за комуністычнае выхаванне моладзі. Неабходна ператварыць масавую агітацыю ў магутную зброю барацьбы за большэвіцкае выкананне рашэнняў нашай партыі і ўрада.

Усім комсамольскім арганізацыям карэнным чынам палепшыць справу антырэлігійнай прапаганды і інтэрнацыянальнага выхавання моладзі.

Камітэтам комсамола заходніх абласцей Беларусі рашуча палепшыць палітыка-выхаваўчую работу сярод моладзі, смялей уцягваць яе перадавую частку ў комсамол.

Абавязаць комсамольскія арганізацыі ўзмацніць ідэйнае і арганізацыйнае кіраўніцтва выхаваннем падрастаючага пакалення, усямерна дапамагаць партыі ў далейшым умацаванні школы, унікаючы ва ўсе дэталі яе работы, змагаючыся за поўнае выкананне закона аб усеагульным навучанні. Комсамольскім арганізацыям узмацніць аўтарытэт настаўнікаў, акружыць іх увагай і клопатамі, стварыць усе ўмовы для плацатворнай работы.

Комсамольскія арганізацыі павінны настойліва выхоўваць у навучаючыхся савецкі патрыятызм, дысцыплінаванасць, рашуча змагаючыся з праявамі хуліганства, з нячэснымі адносінамі да вучобы. Комсамольцы-навучаючыяся павінны паказваць асабісты прыклад узорнай вучобы і дысцыпліны.

Комсамольскім арганізацыям накіроўваць творчую ініцыятыву дзяцей, усямерна садзейнічаючы арганізацыі масавай дзіцячай самадзейнасці, дабіваючыся спалучэння творчай работы школьнікаў з паспяховай вучобай. Прывіваць любоў да працы, да навукі і мастацтва.

Комсамольскія арганізацыі абавязаны ўзначаліць барацьбу за суцэльную граматнасць, прыцягваючы да гэтай работы інтэлігенцыю і шырокую грамадскасць.

XIV з'езд ЛКСМБ патрабуе ад усіх комсамольскіх арганізацый актыўнага ўдзелу ў абаронна-фізкультурнай рабоце, каб кожны комсамолец меў ваенную спецыяльнасць, каб большасць моладзі здала нормы на значкі ГПА і ВС. Усямерна ўзмацніць прапаганду ваеннай справы сярод комсамольцаў і моладзі.

Абавязаць кіруючы комсамольскі актыў паказаць асабісты прыклад у справе ваеннай і фізічнай падрыхтоўкі і распаўсюдзіць ваенныя веды сярод моладзі, наблізіўшы ўсю масавую абаронную работу да баявых умоў. Звярнуць асаблівую ўвагу на ўмацаванне асоавіяхімаўскіх і фізкультурных арганізацый, на падрыхтоўку лётчыкаў, парашутыстаў, выдатных стралкоў, вадзіцеляў машын і стварэнне ў кожным раёне пастоў паветранага нагляду, апавяшчэння і сувязі.

З'езд патрабуе ад усіх комсамольскіх арганізацый настойліва выхоўваць комсамольцаў у духу рэвалюцыйнай пільнасці і разумення асобных задач, стаячых перад комсамольцамі Беларусі, у сувязі з пагранічным становішчам рэспублікі. Гэта абавязвае комсамольскія арганізацыі глыбока правяраць і вывучаць людзей з тым, каб выключыць магчымасць пранікнення варожых элементаў у комсамольскія рады.

З'езд заклікае ўсе комсамольскія арганізацыі ордэнаноснай Беларусі к большэвіцкай рабоце па выкананню рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) і XVIII з'езда КП(б)Б, да далейшага ідэйнага і арганізацыйнага ўмацавання радоў комсамола, уздыму палітычнага выхавання комсамольцаў і моладзі ў духу палкага савецкага патрыятызма, беззаветнай адданасці і любві да вялікай партыі большэвікоў і геніяльнага правадыра партыі і народа, лепшага друга савецкай моладзі таварыша **Сталіна.**



Актывісты комсамольскай арганізацыі 7-га тэкстыльнага камбіната (мястэчка Супрасль). злева направа: Н. Т. Белахонаў (сакратар комсамольскай арганізацыі), А. А. Лемза, Е. І. Міронава, Е. В. Калодка.

Фота А. Сапіра.

ПРАВЯРАЕМ ВЫКАНАННЕ ЎКАЗА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АД 26 ЧЭРВЕНЯ

Нарушаюць працоўную дысцыпліну

Калектыў работнікаў абласнога дарожнага аддзела з вялікім задаволеннем сустрэў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Ён з энтузіязмам прыняўся за работу па-новаму. Чэсная работа, як вядома, дала свае рэзультаты. Аддзел да 1 кастрычніка перавыканаў гадавыя планы дарожна - будаўнічых работ.

Але не ўсе супрацоўнікі працуюць чэсна. Сярод калектыва ёсць такія, якія груба нарушаюць Указ. Начальнік абласнога дарожнага аддзела тав. Мордас запрасіў на работу ў якасці бухгалтара-рэвізора свайго швагра Н. Аўтуховіча, а родзіча Кнігу ў якасці шофера, Амеленка — начальнікам Цэханавецкага раённага дарожнага аддзела, Пісарэнка — па розных даручэннях. Гэтыя людзі дэзарганізуюць работу ўсяго калектыва. Яны карыстаюцца неабмежаванымі правамі і падтрымкай начальніка аддзела тав. Мордаса. У рабочы час ходзяць у магазіны, піўныя. Начальнік аддзела, як відаць, рашыў, што Указ да яго родзічаў не датычыць.

Да рэчы, Аўтуховіч у бухгалтэрыі вельмі мала разбіраецца. Амеленка развалiў работу Цэханавецкага дарожнага аддзела. План дарожнага будаўніцтва сарван. Загатоўленыя матэрыялы расцягнуты. Сам Амеленка не мае ніякага прадстаўлення аб дарожных работах.

Доўгі час Кніга, як «незамянімы», атрымліваў два аклады—інспектара кадраў і шофера. Учот кадраў запушчаны, аднак гэта яму не перашкаджала атрымоўваць зарплату як інспектару кадраў. Ён у адну з сваіх вясёлых паездак за горад вывеў машыну са строю, рамонт якой абышоўся больш чым у тысячу рублёў.

У дарожным аддзеле ёсць легкавая аўтамашына. Але яна скарыстоўваецца не для службовых раз'ездаў, а, як правіла, для абслугоўвання асабістых патрэб Мордаса. У апошні час жонка Мордаса, атрымаўшы водпуск, паехала ў г. Магілёў. Прайшло ўжо 10 дзён, а машына знаходзіцца ў Магілеве. У гэты-ж час паехаў і інспектар па кадрах (ён-жа і шофер) Кніга. Але-ж ні камандыроўкі, ні водпуску Кніга не мае.

А. Грэйдэр

Павысілася прадукцыйнасць працы

На нашай 32-й вацінна-ватнай фабрыцы цякучасць рабочай сілы была большая, чым на іншых прадпрыемствах. Таму і працоўная дысцыпліна была на нізкім узроўні.

Пасля Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня калектыў фабрыкі дружна ўзяўся за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны. Указ быў даведзен да свядомасці кожнага рабочага і служачага. Прагульшчыкаў і лодыраў-дэзарганізатараў вытворчасці — асудзілі. З саставу фабрычнага камітэта выведзен Внушынскі, які патураў прагульшчыкам, а затым і сам зрабіў прагул.

Прагулы на фабрыцы вяўхільна віжаюцца. За трэцюю дэкаду верасня быў адзін прагул, а за першую дэкаду кастрычніка не было ні аднаго прагулу. Сярод кадравых рабочых прагулаў і спазненняў на работу не назіраецца. Нарушэнні працоўнай дысцыпліны бываюць галоўным чынам з боку маладых рабочых. Гэта сведчыць аб тым, што нам трэба праводзіць сістэматычную растлумачальную работу сярод маладых рабочых.

Разам з умацаваннем працоўнай дысцыпліны расце і прадукцыйнасць працы. На капіталістычнай фабрыцы ткач на рашэль-машыне даваў па 120 метраў вяціну за 8 гадзін. працуючы на адным станку. Цяпер сярэдняя выпрацоўка рабочага складае 165 метраў.

Але было-б памылкова супакойвацца на дасягнутым. У нас яшчэ ёсць рад недахопаў. Нярэдка прадзільныя машыны не маюць поўна нагрузкі, а гэта выклікае прастоі вязальнага цэха. Адсутнасць у дастатковай колькасці сыравіны тармозіць работу. Фабрыка яшчэ не поўнасцю забяспечана кваліфікаванымі кадрамі прадзільшчыкаў.

Дружнымі намаганнямі ўсяго калектыва мы пераможам маючыяся недахопы, і наш калектыў будзе працаваць яшчэ лепш і больш прадукцыйна.

В. Цукерман,
рэдактар насценгазеты вацінна-ватнай фабрыкі № 32.

Сустрэнем дзень выбараў поўным выкананнем плана

ВАЎКАВЫСК. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** З пачуццём глыбокага задаволення рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі цэментнага завода Рось сустрэлі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб назначэнні дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На цэхавых сходах рабочыя ў сваіх выступленнях выказвалі гатоўнасць прыйсці да дня выбараў з новымі вытворчымі поспехамі.

Вылучэнец, начальнік упаковачнага цэха т. Пугач і рабочы Енгар заявілі, што выбары ў мясцовыя Советы іх цэх азнаменуе выдатнай стаханаўскай работай і выканае вытворчую праграму на 140 працантаў.

Рабочы кар'ера тав. Атановіч сказаў:

— Рабочыя кар'ера абязуюцца да дня выбараў выканаць вытворчы план на 130 працантаў.

Калектыў завода абавязаўся выканаць гадавы план да 12 снежня.

Д. Казлоў.



Стаханаўка тав. Ярізях В. І.—ткачыха ворса Беластоцкай дзяржаўнай плюшавай фабрыкі № 31, якая пры добраякаснай прадукцыі выконвае норму на 127 проц.

Фота А. Сапіра.

ДЫСЦЫПЛІНА І АРГАНІЗАВАНАСЦЬ — ЗАЛОГ ПОСПЕХУ

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня, падтрыманы мільёнамі працоўных Совецкага Саюза, патрабуе рашучай барацьбы з дэзарганізатарамі вытворчасці — лодырамі, разгільдзяямі, рвачамі і іх патуральнікамі.

Аб становішчы працоўнай дысцыпліны на 1-м камбінаце можна меркаваць па наступных даных: у ліпені было 19 прагулаў і 61 спазненне да 20 мінут, у жніўні — 24 прагулы і 37 спазненняў, у верасні—15 прагулаў і 21 спазненне, а за першую палову кастрычніка ўсяго 2 прагулы. Знізіліся і спазненні на работу. Лепш абстаіць справа з працоўнай дысцыплінай у ткацкім цэху, дзе ў верасні і кастрычніку зусім не было прагулаў.

Аднак нельга сказаць, што ўсё ў парадку. Не гледзячы на прынятыя мер да паасобных рабочых, апошнія ўсё-ж паўтараюць нарушэнне працоўнай дысцыпліны. Так, напрыклад, ворсаўшчык Аляксандр Шушынскі спазніўся тры разы, Абрам Марголіс — тры разы.

Пераважная большасць рабочых і служачых — адданыя, чэсныя работнікі. Яны строга выконваюць совецкія законы, захоўваюць дысцыпліну працы, берагуць і ўмацоўваюць грамадскую социялістычную ўласнасць, як свяшчэнную і недатыкальную аснову совецкага ладу. Гэта мы бачым на прыкладзе камсамольска-маладзёжнай стаханаўскай брыгады, арганізаванай у жніўні. Гэта брыгада складаецца з 12 ткачоў-двухстаночнікаў, чатырохстаночнікаў, двух падмайстраў і аднаго майстра. Брыгадзірам стаханаўскай брыгады з'яўляецца чатырохстаночнік тав. Меламед, які выконвае норму выпрацоўкі на 111 працантаў. Такія-ж паказчыкі даюць чатырохстаночнікі тт. Бахрах, Тыкоцкі і іншыя. Брыгада дабілася поўнай ліквідацыі прагулаў і спазненняў на работу. Выкананне норм выпрацоўкі за верасень складае 107,3 процанта. Прастой ткацкіх станкоў даведзен да двух працантаў. Выпрацоўка няпоўнацэннай прадукцыі ў верасні даведзена да аднаго процанта.

Комсамольска-маладзёжная стаханаўская брыгада ўключылася ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва і абавязалася выканаць кастрычніцкі план на 112 процантаў, поўнасцю ліквідаваць выпуск сураўя другога сорту, замацаваць дасягнутыя поспехі і дапамагаць адзін другому ў рабоце. Яны таксама абяцалі павысіць свой палітычны і культурны ўзровень, дабіцца павышэння дзелавой кваліфікацыі. Стаханаўская брыгада звярнулася да ўсіх рабочых камбіната з заклікам дастойна сустрэць прадстаячую слаўную гадавіну.

Моладзь на камбінаце складае адну трэць усяго калектыва. Таму комсамольская арганізацыя камбіната павінна ўзначаліць вытворчы ўздым, які ёсць сярод маладых рабочых прадпрыемства і пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі працаваць лепш, больш прадукцыйна.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня стварае новыя магчымасці далейшага ўздыму прадукцыйнасці працы, развіцця і росту соцыялістычнага прадпрыемства.

У чым сутнасць метадаў работы знатных людзей камбіната? Яны максімальна ўшчыльнілі свой рабочы дзень, поўнасцю аўладалі тэхнікай, умеюць цаніць фактар часу, а самае важнае — ахоплены жаданнем мацаваць магутнасць сваёй радзімы.

Адной з галоўных задач кіраўніцтва камбіната — гэта вырошчваць дысцыплінаваных і свядомых працаўнікоў соцыялістычнага грамадства, прывіваць усяму калектыву рабочых і служачых настойлівасць, высокую арганізаванасць, сапраўдную вытворчую культуру. У гэтым залог поспеху.

Ш. Белкін,
начальнік аддзела працы і зарплаты 1-га тэкстыльнага камбіната.

Соцыялістычнай прамысловасці— новыя кваліфікаваныя кадры!

На сходзе вясковай моладзі

У вёсцы Вежбава, Граеўскага раёна, адбыўся сход вясковай моладзі. На сходзе быў абмяркован Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах. На сходзе прысутнічала звыш 60 чалавек.

— Батрацка-бядняцкая моладзь,— гаварыў на сходзе Зігмунд Сенкевіч, — пры ўладзе памешчыкаў і капіталістаў была асуджана на беспрацоўе. Яна мела права толькі выйсці ў пастухі.

— Толькі дзякуючы совецкай уладзе наша моладзь атрымала магчымасць вучыцца і набыць кваліфікацыю, — гаворыць Юзеф Бояр. — Вялікае дзякуй таварышу Сталіну за клопаты аб моладзі!

Бояр і Сенкевіч выказалі сваё жаданне пайсці вучыцца ў школу фабрычна-заводскага абучэння.

Мароз.

Будзем высокакваліфікаванымі спецыялістамі

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб стварэнні дзяржаўных працоўных рэзерваў сустрэў гарачы водгук сярод працоўнай моладзі Ваўкавыскага раёна. У апошнія дні ў раённую камісію па прызыву ў рамесленыя, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння паступіла ад моладзі 23 заявы.

15 кастрычніка ў райвыканком прыйшоў з заявай малады калгаснік калгаса «Першае мая» Сцяпан Грыгоравіч Папасюк. У сваёй заяве ён піша: «Хачу стаць высокакваліфікаваным спецыялістам. Прашу залічыць мяне ў рамесленае вучылішча».

Разам з Сцяпанам Папасюком прыйшлі Грыгорый Наско, Іван Чыжык, Уладзімір Максімавіч і Уладзімір Аўгусцінавіч Качароўскія з вёскі Шусцікі, Мсцібаўскага сельсовета. У гутарцы з старшынёй камісіі тав. Лашуком усе яны выказалі жаданне паступіць у рамесленае вучылішча.

З Дзевяткаўскага сельсовета паступіла заява ад Еўгенія Пікус. Ён таксама просіць прыняць яго ў рамесленае вучылішча.

К. Даніловскі.

Сход сельскага актыва Крынкаўскага раёна

Днямі ў крынкаўскім кінотэатры адбыўся сход сельскага актыва раёна — старшынь сельсоветаў і калгасаў, брыгадзіраў, звеннявых.

Даклад аб Указе Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і пастанове Соўнаркома СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах зрабіў сакратар райкома партыі тав. Главіцкі.

У прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі схода заявілі: «Мы пашлём у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння перадавую моладзь нашых калгасаў».

Сход абмеркаваў пытанне аб падрыхтоўцы да святкавання XXIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. У прынятым рашэнні сельскі актыў раёна абавязаўся шырока разгарнуць перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне сельскагаспадарчых работ, падрыхтоўку калгасаў да зімы і выкананне дзяржаўных абавязацельстваў.


С. Эцін.

Моладзь падае заявы

Вучні Скідэльскай яўрэйскай няпоўнай сярэдняй школы падаюць заявы з просьбай аб прыняцці іх у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. 16-гадовы вучань 6-га класа Якуб Ляміпдот у сваёй заяве піша: «З вялікім натхненнем і радасцю я прачытаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб стварэнні рамесленых і чыгуначных вучылішч і школ фабрычна-заводскага абучэння. Я прашу прыняць мяне ў чыгуначнае вучылішча. Буду з чэсцю выконваць усе ўскладзеныя на мяне абавязкі і вучыцца на «выдатна».

Такія заявы паступаюць ад вучняў і другіх школ раёна.

Аўчыннікаў.



Устаноўка станкоў у слясарнай майстэрні арганізуемай школы ФЗА пры Ружанскім райпрамкамбінаце (Брэсцкая вобласць). За работай слесары І. Г. Гавурын (злева) і Н. І. Агароднік.

Фота В. Лупейка.
Фотахроніка БЕЛТА.

МАСТАЦТВА БУРАТ-МАНГОЛЬСКАГА НАРОДА

На прыёме дэлегацыі працоўных Бурат-Манголіі таварыш Молатаў у сваёй прамове сказаў, што «Бурат-мангольская рэспубліка, не гледзячы на ўсю сваю адсталасць у мінулым, па сваёй настойлівасці ў стварэнні новага, соцыялістычнага жыцця, па рабоце калгасаў і развіццю культурных пачынанняў адносіцца да перадавых совецкіх рэспублік».

Прадстаячая дэкада Бурат-Мангольскага мастацтва ў Маскве з'явіцца бліскучым падцвярджэннем гэтых слоў главы Совецкага ўрада. Яна прадэманструе перад працоўнымі сталіцы народнае мастацтва, квітнеючае пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Шматвяковае прыгнечанне, пагубны ўплыў служак рэлігіі, якія разам з царызмам імкнуліся трымаць народ у кабале, перашкаджалі развіццю нацыянальнай культуры. Ламы і шаманы, якія знаходзіліся пад апекай царскіх чыноўнікаў, адкрыта прыстасоўвалі музыкальную і песенную творчасць народа для рэлігійных мэт. Рад адвечных інструментаў быў адабран у народа для адпраўлення рэлігійных абрадаў. Людзі, забітыя і загнаныя, былі пазбаўлены правоў на імі-ж створаную музыкальную культуру. Старая бурацкая пагаворка гаварыла: «Сіроты бываюць сказальнікамі, беднякі— песнярамі». Блукаючы па стэпавых вандроўшчах, ад аймака да аймака, ад улуса да улуса, з юрты ў юрту, песняры і сказальнікі складалі песні і казанні аб горкай долі свайго народа.

Вызваленае Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыяй бурат-мангольскае мастацтва быстра расцвітае. Песня, музыка і танец ачышчаюцца ад рэлігійнага налёту і становяцца неад'емнай, арганічнай часткай адраджаючайся культуры. З гушчы народных мас выяўляюцца сапраўдныя таленты. Паяўляюцца цудоўныя песняры, музыканты, драматургі, рэжысеры. Ствараецца свой бурат-мангольскі тэатр, і народ чуе цяпер свае векавечныя мелодыі пераўтворанымі ў поўную сілу гучання.

Усе спектаклі, якія пройдуць у час дэкады, абавязаны сваім нараджэннем, галоўным чынам, разнастайнай і невычарпальнай песеннай творчасці народа. Бурат-мангольская песня вельмі багата мелодыямі і красачнымі інтанацыямі. Яна яркая і выразная. Музыкальная мова бурат-мангольскіх опер—плоць ад плоці народнай музыкальнай творчасці. Драматургічны матэрыял, на якім пабудаваны спектаклі, таксама надзвычайна чароўны. Ён проста і эмацыянальна насычан. Ён звязан з лепшымі ўзорамі народнага эпаса.

Першая бурат-мангольская опера называецца «Энхе—булат батор». Яе творцы—кампазітар М. Фралоў і Н. Балдано—аўтар лібрэта (як артыст тэатра ён выконвае адну з цэнтральных ролей у спектаклі). У оперы расказваецца аб народным героі Энхе, аб яго выдатных подзвігах у славу сваёй радзімы, аб сіле, якую Энхе набыў дзякуючы народу.

Энхе украў у свайго бацькі-дэспата свяшчэнны меч—сімвал яго ханскай магутнасці. За гэта Энхе зняволен у падзямелле, дзе падпадае жорсткім катаванням і здзекам. У краіну ўрываюцца войскі суседняга хана Шараддая. Военачальнікам назначаецца Эрхэ—брат зняволенага. Труслівы, бяздарны Эрхэ здраджвае краіне, кідае войскі і ўцякае ў горы. Народ абураны, ён патрабуе вызвалення томячагася вязня Энхе, якому даручае весці войскі ў бой за айчыну. Энхе набывае багатырскую сілу.



Бурат-Мангольскі музыкальна-драматычны тэатр пакажа ў час дэкады дзве музыкальныя п'есы—«Баір» і «Эржэн» і оперу «Энхе булат-батор».

На здымку: заслужаны артыст Бурат-Мангольскай АССР В. К. Халматаў у ролі Баіра.

Фота М. Рунова. Фота ТАСС.

Ён ратуе сваю краіну і знішчае ворага. Народ пазнае, што Энхе—сын багатыра Салбон-Батона, а не хана. Краіна святкуе перамогу. Энхе булат-батор гаворыць свяшчэнную клятву вернасці свайму народу.

Асноўнае месца ў музыцы оперы займае хор; народ з'яўляецца галоўнай дзеючай асобай. Кампазітар імкнецца з'яднаць у адно стройнае цэлае і шчыра чуллівыя арыі асобных дзеючых асоб і гераічныя песні народа.

На адным з першых этапаў нараджэння бурат-мангольскай нацыянальнай оперы стаіць створаная нядаўна музыкальная драма «Баір» («Радасць»). Яна пабудована ў асаблівай манеры: у гэтым спектаклі оперныя элементы ўмела спалучаюцца з разгаворнай мовай.

... На спаборніцтвах па стральбе з лука перамагае багатыр Баір. Яго любіць прыгажуня Булган. Але ў Баіра ёсць сапернік—каварны і злы паляўнічы Сута Мерген. Ён задаўся мэтай разбіць шчасце маладых людзей. У час вяселля Баіра і Булган Сута крадзе нявесту і адвозіць яе ў палац хана, дзе дзяўчына ў няўцешным смутку па каханым праводзіць свае дні ў зняволенні. Яна спявае песні, поўныя смутку і роспачы. Служка хана стары Буханай, расчулены горам прыгажуні Булган, наладжвае ўцёк дзяўчыны ў краіну Баіра. Хан апалеў. Ён узнімае войскі і вядзе іх супроць Баіра. Адбываецца кровапралітная схватка. Ханскія войскі пераможны. Каварны Сута выяўлен у здрадзе народу і публічна пакаран смерцю.

Льюцца ўрачыстыя песні перамогі ў чэсць героя Баіра і яго самаадданай нявесты Булган.

Як і опера «Энхе», музыкальная драма «Баір» (аўтары А. Шадаеў і Г. Цыдэнжапаў; музыка П. Берлінскага і Б. Ямпліва) пабудована на глыбокіх хвалюючых народных матывах, на сюжэтах чаруючых бурат-мангольскіх казак.

Бурат-мангольскі нацыянальны тэатр павінен паказаць таксама музыкальную п'есу «Эржэн» (музыка Марошкіна, лібрэта Балдано і Эдэль). Гэта п'еса напісана на сучасную тэму і прысвечана нашай моладзі, новым прынцыпам маралі ў совецкай сям'і. Тут нам прадстаіць пачуць песні аб шчаслівым жыцці ў сям'і вызваленых народаў, аб працы, якая дае радасць і задаволенне.

Мы ведаем, што бурат-мангольскі нацыянальны тэатр вырас за самы кароткі час. Нам, музыкальным дзеячам, якія пільна сочаць за ўсімі, самымі найменшымі расткамі новай культуры, добра вядома сучаснае становішча і гэтага тэатра. Ён вырас цяпер у вялікі прафесіянальны калектыў з кваліфіцыраванымі салістамі, з хорам, балетам і аркестрам.

Такія імёны, як Гамбо Цыдэнжапаў і Намжыл Балдано, ужо неаднаразова паяўляліся ў друку ў сувязі з рыхтуючайся дэкадай. Гамбо Цыдэнжапаў быў адзін час брадзячым акторам-імправізатарам. Затым доўгі час працаваў грузчыкам і потым вучыўся тэатральнаму мастацтву. Намжыл Балдано—былы кінамеханік у раённым клубе. Ён прарабіў слаўны шлях ад піонер-важатага і сакратара сельсовета да актора і драматурга першага ў рэспубліцы нацыянальнага тэатра. У трупе тэатра—Тараў, у мінулым батрак, рабочы-шкляр, які ўзначальваў да апошніх дзён раённы выканком Совета дэпутатаў працоўных, Бадма Балдакоў — ціхаакіянскі чырвонафлотец. Выдатныя таленавітыя самавучкі-мастакі, скульптары, чаканшчыкі — працавалі над афармленнем спектакляў дэкады, якія абяцаюць быць надзвычайна красачнымі...

Асобна трэба сказаць аб аркестры народных інструментаў, які таксама пакажа сваё майстэрства ў дні дэкады. Не гледзячы на тое, што гэты аркестр не існуе яшчэ і года, ён усё-ж здолеў згуртавацца ў стройны, добра зладжаны ансамбль. З вялікай цікавасцю мы будзем чакаць выступлення гэтага аркестра, які выконвае і класічныя творы.

Несумненную цікавасць павінны прадставіць выступленні харавых калектываў, сказальнікаў, танцораў. Сяло Вялікі Куналей пасылае ў Маскву на дэкаду свой хор. Ён складаецца з сямейцаў. Гэта — патомкі раскольнікаў, высланых Пятром І з цэнтральных губерань Расіі сюды на пасяленне. Яны захавалі ў поўнай недатыкальнасці да нашых дзён сваю асаблівую мову, свае песні, якія яны выконваюць у старыннай манеры.

Мы чакаем ад дэкады паказу раднасага жыцця народа, паказу ў мастацка-музыкальных вобразах барацьбы бурат-мангольскага народа за сваё вызваленне.

У той-жа час дэкада павінна з'явіцца для бурат-мангольскага тэатра своеасаблівай школай новай культуры.

Народная творчасць совецкай Бурат-Манголіі і ў далейшым павінна развівацца ў цеснай сувязі і пад уплывам магутнай рускай культуры. Зусім ясна, што бурат-мангольскі народ, як і ўсе народы, вызваленыя Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыяй, аказаўся здольным «рушыць наперад **сапраўды** перадавую культуру і **сапраўды** перадавую цывілізацыю нікольк не менш, чым народы еўрапейскія» (Сталін).

Росквіт культуры бурат-мангольскага народа знамянуе сабой тарджаство ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, вялікіх ідэй большэвіцкай партыі, якая будуе комуністычнае грамадства.

П. П. Штэйнберг,
Народны артыст Саюза ССР, ордэнаносец.

ЗАРУБЯЖОМ

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 21 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе:

«Германская падводная лодка патапіла англійскі дапаможны крэйсер водазмяшчэннем звыш 10 тысяч тон. У час аперацый супроць двух англійскіх караванаў суднаў было патоплена некалькі суднаў агульным танажам у 53.300 тон. Танаж суднаў, патопленых падводнай лодкай пад камандаваннем капітан-лейтэнанта Шэпке, дасягае 40.565 тон.

Увечары 20 кастрычніка германскія самалёты-тарпеданосцы патапілі ля ўсходняга ўзбярэжжа Англіі ішоўшыя пад узмоцненым канвоем тры гандлёвых параходы агульным танажам у 20 тысяч тон. Злучэнні лёгкіх бамбардыроўшчыкаў працягвалі налёты на Лондан і іншыя гарады ў Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі. Паспяховай бамбардыроўцы падвергліся докі, партовыя збудаванні і важнейшыя базы забеспячэння. Бомбы, якія папалі ў буйнае нафтасховішча ў Тэмзхавене, выклікалі новыя пажары. Ноччу злучэнні цяжкіх бамбардыроўшчыкаў узмоцнілі атакі супроць Лондана, скінуўшы многа бомб розных калібраў. На абодвух баках Тэмзы ўспыхнулі пажары, прычыніўшыя значныя разбурэнні. Германскія самалёты бамбардыравалі таксама ваенныя заводы ў Цэнтральнай Англіі і партовыя збудаванні на заходнім узбярэжжы Англіі.

Германская цяжкая палявая і марская артылерыя абстраляла два буйных непрыяцельскіх гандлёвых параходы ў порту Дуўра. Снарады, якія папалі ў судны і партовыя збудаванні, прычынілі ім значныя разбурэнні. Непрыяцельская дальнабойная артылерыя ў адказ адкрыла агонь па французскаму ўзбярэжжу Ла-Манша, не прычыніўшы ўрону.

Непрыяцельскія самалёты мінулай ноччу скінулі бомбы над Берлінам і іншымі гарадамі. У Заходняй Германіі бомбы ўпалі на чыгуначнае палатно, аднак, рух паяздоў не быў парушан. Разбурана некалькі жылых дамоў. Сярод насельніцтва налічваецца некалькі забітых. Учора непрыяцель страціў 19 самалётаў. 4 германскіх прапалі без весткі.

Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, за ўчарашнія суткі германская авіяцыя скінула над Англіяй звыш поўмільёна кілаграмаў бомб.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 21 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у ноч на 20 кастрычніка атакі германскай авіяцыі на Англію адбываліся ў некалькі большым маштабе, чым у папярэднія ночы. Атакі дасягнулі найбольшай сілы з наступленнем цемры, калі былі зроблены налёты на Лондан, на Цэнтральную частку Англіі і на гарады ў Паўночна-Заходняй частцы краіны. Над абшырнай тэрыторыяй Лондана і яго прадмесцяў было скінута мноства фугасных і запальваючых бомб. Пашкоджана многа жылых дамоў і іншых будынкаў. Шматлікія пажары, узнікшыя ў выніку бамбардыровак, хутка ліквідаваны. Сярод насельніцтва гэтых пунктаў налічваецца многа забітых і раненых. Аб'ектам налётаў у Цэнтральнай частцы Англіі з'явіўся адзін з гарадоў, дзе ўзнікла некалькі пажараў. Пашкоджаны жылыя дамы, магазіны, гандлёвыя прадпрыемствы. Колькасць забітых і раненых нязначная. У раёне ракі Мерсей і ў некаторых гарадах гэтага раёна страты ў выніку налётаў нязначны і колькасць афяр невялікая. Бамбардыроўцы падвергласа таксама многа пунктаў ва Уэльсе, аднак у выніку гэтай бамбардыроўкі матэрыяльныя страты нязначныя і афяр нямнога.

У ноч на 19 кастрычніка англійская авіяцыя зноў падвергла паспяховай бамбардыроўцы германскія докі і верфі. Англійскія бамбардыроўшчыкі скінулі бомбы на верфі ў Гамбургу. Не гледзячы на неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, бамбардыроўка гэтых верфей працягвалася амаль тры з паловай гадзіны. Паспяховай атацы падвергласа таксама ваенна-марская база ў Кіле. Нізкая воблачнасць не дала магчымасці вызначыць размеры зробленых разбурэнняў у доках Гамбурга, Эмдэна і Любека. Аднак, як мяркуюць, моцны ўрон прычынен докам Гамбурга.

Іншыя злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў, якія аперыравалі над Рурскай вобласцю, не гледзячы на інтэнсіўны агонь зенітных батарэй, падвергі бамбардыроўцы алюмініевыя заводы паблізу Дортмунда. На гэтыя заводы скінуты тоны фугасных і запальваючых бомб.

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

НЬЮ-ЙОРК, 20 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што ў ноч на 20 кастрычніка першыя чатыры налёты на Лондан былі такімі-ж жорсткімі, як і налёты 15 кастрычніка, якія і лічацца самымі моцнымі. Германскія бамбардыроўшчыкі паяўляліся над цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй часткай Англіі, скідваючы масу фугасных і запальваючых бомб.

Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што налёт на Лондан у ноч на 20 кастрычніка быў адным з мацнейшых, але пасля поўначы наступіла некаторае зацішша. Над Лонданам сталі паяўляцца адзінкавыя самалёты замест буйных злучэнняў. Бамбардыроўкай пашкоджаны бомбасховішчы і жылыя дамы. Па ліку афяр гэты налёт з'яўляецца адным з найжорсткіх. Дзве бомбы ўпалі на рэстараны ў Лондане, дзе налічваецца многа забітых. Узнікла мноства пажараў.

Сустрэча англійскіх дыпламатаў

ЛОНДАН, 21 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, заўтра ў Стамбул прыязджае англійскі пасланік у Белградзе Кэмпбел для гутаркі з англійскім паслом у Турцыі Нэтчбэл-Хьюжэсенам.

Англійскі пасланік у Сафіі Рэндзел, які гасціў у Нэчбэл-Хьюжэсена на працягу трох дзён, выехаў учора ўвечары ў Сафію.

—0—

АНТЫСЕМІЦКІ ЗАКОН ВА ФРАНЦЫІ

ЛІОН. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што ўчора ў Вішы быў апублікаваны так званы «яўрэйскі статут». Згодна гэтаму закону, яўрэем ва Францыі лічыцца ўсякая асоба, якая ў трох пакаленнях мае прамых родзічаў яўрэяў або якая мае такіх родзічаў у двух пакаленнях і жонку яўрэйку (або мужа яўрэя). Яўрэям забараняецца займаць усе вышэйшыя пасады ў адміністрацыйных і ўрадавых установах. Яны не могуць быць настаўнікамі і афіцэрамі і не могуць займаць кіруючыя пасты на прадпрыемствах, якія карыстаюцца дзяржаўнай субсідыяй. Доступ да іншых грамадскіх пасад яўрэю дазваляецца толькі ў тым выпадку, калі ён мае картку ўдзельніка вайны 1914 года або калі ён быў адзначан загадам у час ваенных дзеянняў 1939—40 года, узнагароджан ордэнам «Пачотнага легіёна» або ваеннай медаллю. Доступ да свабодных прафесій яўрэям дазваляецца, калі толькі для іх не будзе ўстаноўлена працэнтнае абмежаванне.

Яўрэі ні пры якіх умовах не могуць быць выдаўцамі або рэдактарамі газет, журналаў і агенцтваў, за выключэннем выдавецтваў навуковага характару, дырэктарамі кінематаграфічных фірм тэатраў, кінотэатраў, рэжысёрамі, кіраўнікамі радыёперадач. Яўрэі не могуць састаяць у арганізацыях, якім даручана прадстаўляць свабодныя прафесіі. Яўрэі, якія знаходзяцца на дзяржаўнай службе і падпадаюць пад дзеянне гэтага закона, павінны спыніць сваю работу па сканчэнні двух месяцаў з дня выдання «яўрэйскага статута». Для яўрэяў, якія маюць у літаратурнай, навуковай і мастацкай дзейнасці асобыя заслугі, можа быць зроблена выключэнне. Апублікаваны «яўрэйскі статут» рашана прымяніць як ва Францыі, так і ва ўсіх калоніях.

—0—

ПРЭЗІДЭНТ ФІНЛЯНДЫІ РАТЫФІЦЫРАВАЎ СОВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКІ ДАГАВОР АБ ДЭМІЛІТАРЫЗАЦЫІ АЛАНДСКІХ АСТРАВОЎ

ХЕЛЬСІНКІ, 20 кастрычніка. (ТАСС). Фінляндскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, «што прэм'ер-міністр Фінляндыі Руці, выконваючы часова абавязкі прэзідэнта, ратыфіцыраваў учора дагавор паміж Фінляндыяй і Совецкім Саюзам аб дэмілітарызацыі Аландскіх астравоў».



На ўроку фізікі ў 6-м класе І-й польскай сярэдняй школы г. Беластока. Фота А. Сапіра.

30-ГОДДЗЕ ЛІТАРАТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ

Юбілейны вечар у Беластоку

19 кастрычніка ў беластоцкім Доме пісьменніка адбыўся юбілейны вечар, прысвечаны літаратурнай дзейнасці выдатнага беларускага пісьменніка-ордэнаносца Змітрака Бядулі. На вечары прысутнічалі беларускія, польскія і яўрэйскія пісьменнікі і паэты, а таксама літгуртакоўцы педагагічнага інстытута.

Змястоўны даклад аб жыцці і літаратурнай творчасці юбіляра зрабіў беларускі паэт Максім Танк. Дакладчык падрабязна ахарактарызаваў слаўны шлях служэння працоўнаму народу, пройдзены адным з старэйшых пісьменнікаў Беларусі, спыніўся на ўсіх буйнейшых творах Змітрака Бядулі, якія залатым фондам увайшлі ў скарбніцу беларускай літаратуры.

Беларускі паэт Пімен Панчанка ў сваім выступленні падзяліўся ўражаннямі аб асабістым знаёмстве з Змітраком Бядулем, падкрэсліў выключную дапамогу, якую аказаў і аказвае Змітрок Бядуля маладым пісьменнікам.

У аднадушна прынятай на вечары прывітальнай тэлеграме юбіляру беластоцкія пісьменнікі і літгуртkоўцы віншуюць Самуіла Ефімавіча з 30-годдзем плённай літаратурнай работы, ад шчырага сэрца жадаюць яму многіх год здароўя і поспехаў на карысць сацыялістычнай радзіме.

Затым пачынаецца мастацкае чытанне твораў Змітрака Бядулі. Літгуртkоўцы Валянціна Марушко, Нікалай Кваст, Зінаіда Кузняцова, Вячэслаў Грынец, Елена Шырма і Ольга Налівайка прачыталі рад вершаў і навел пісьменніка.

З чыткай сваіх новых вершаў на вечары выступілі паэты Філіп Пестрак, Максім Танк і Пімен Панчанка.

А. Н.

Вечар у лагеры

Кожны дзень, калі згушчаюцца змрокі і палаткі ў лагеры белымі пірамідамі выдзяляюцца на цёмнай сцяне лесу, ціпышю разрывае гучная мелодыя чырвонаармейскай песні, услед якой далёка разносяцца пералівы гармонікі. Сабраўшыся ля палаткі, байцы і малодшыя камандзіры спяваюць песні аб магутнасці і доблесці Чырвонай Арміі, аб несакрушальнасці сваёй квітнеючай радзімы. Некалькі воддаль, над сталом схіліліся чырвонаармейцы тт. Верлінскі і Валавенскі, якія дагрываюць чарговую партыю ў шахматы.

Недалёка, у прыземістым доміку, чуваць ажыўленне і смех. Тут ідзе рэпетыцыя. Самадзейны драматычны калектыў падраздзялення, якім камандуе тав. Янкоў, рыхтуе да святкавання XXIII гадавіны Кастрычніка пастаноўку ўрыўкаў з п'есы «Павел Грэкаў». Абавязкі рэжысёра выконвае старшына падраздзялення тав. Сінічэнка. У падраздзяленні ён слыве адным з лепшых запявал, танцорам і незвычайным выканаўцам драматычных ролей у п'есах.

Арганізоўваючы вясёлы і культурны адпачынак байцоў і малодшых камандзіраў, старшына тав. Сінічэнка аб'яднаў усіх спевакоў, танцораў, музыкантаў, чытальнікаў падраздзялення ў самадзейны калектыў, сістэматычна займаецца з імі і выступае з вялікім поспехам перад чырвонаармейцамі і камандзірамі.

У гэтым годзе сіламі калектыва мастацкай самадзейнасці, кіруемага т. Сінічэнка, было дана некалькі выдатных канцэртаў у часці і падшэфных арганізацыях.

Песня, музыка і пляскі сталі неадрыўнай часткай чырвонаармейскага адпачынку. Добра і культурна праводзячы свой вольны час, байцы і камандзіры на наступны дзень з новымі сіламі прымаюцца за работу і вучобу.

Ал. Окунеў.

НОВЫ РАДЫЁВУЗЕЛ

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** Граеўская раённая кантора сувязі прыступіла да абсталявання радыёвузла. Неабходная апаратура ўжо атрымана. Абсталяванне раённага радыёвузла дасць магчымасць радыёфіцыраваць усе сельсоветы раёна.

Радыётрансляцыі пачнуцца ў дзень святкавання 23-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Вузел разлічан на 700 радыёкропак.

ГРОДНА Ў ГАДАВІНУ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

На прадпрыемствах, ва ўстановах горада праходзіць энергічная падрыхтоўка да кастрычніцкіх урачыстасцей. Прапагандысты і агітатары праводзяць гутаркі, даклады, лекцыі на тэмы: «Ленін і Сталін—стваральнікі першай у свеце совецкай дзяржавы».

Камісія па правядзенню кастрычніцкіх дзён зацвердзіла план святкавання. Вуліцы, плошчы горада будуць упрыгожаны плакатамі, лозунгамі, мастацкімі пано, партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада.

Красачнае будзе афармленне калон дэманстрантаў. На сваіх плакатах і лозунгах яны адлюструюць вялікія правы совецкіх грамадзян, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі. Скурзавод № 5 пакажа працэсы сваёй работы, прадэманстрыруе віды вырабаў хрому. Калона веласіпеднага завода будзе несці вялікую мадэль самалёта, зямны шар з паказам граніц неабсяжнай совецкай дзяржавы.

Табачная фабрыка афармляецца на тэму: «Абарона краіны». У першых радах дэманстранты будуць несці тры лозунгі, напісаныя вялікімі пазалочанымі літарамі: «У нас ёсць чым абараняцца», «У нас ёсць што абараняць», «У нас ёсць каму абараняць». Кожнаму лозунгу адпавядае мастацкае пано. Табачнікі панясуць таксама партрэты членаў палітбюро на чале з таварышам Сталіным. Цікава будзе афармлена і сама фабрыка. На адным з галоўных корпусаў на вышыні 30 метраў будзе красавацца вялікі самалёт з верцячымся прапелерам, асветлены праменнямі пражэктара. На самалёце будзе лозунг—«Няхай жыве XXIII гадавіна Кастрычніка», а ўнізе—пяціметравыя партрэты таварышоў Леніна і Сталіна.

Увечары 6 лістапада ў гарадскім тэатры адбудзецца ўрачыстае пасяджэнне ГК КП(б)Б і горсовета сумесна з партыйнымі, комсамольскімі, прафсаюзнымі арганізацыямі і стаханаўцамі горада.

7 і 8 лістапада па школах будуць праведзены дзіцячыя раніпнікі, гутаркі аб свяце.

Г. Лупсякоў.

ПАВЕДАМЛЕННІ

23 кастрычніка, у 8 гадзін вечара, у памяшканні Дома партасветы адбудзецца агульнагарадскі сход інтэлігенцыі па пытанню падрыхтоўкі і ўдзелу ў выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Дакладчык—сакратар абкома КП(б)Б тав. Сямёнаў.

На сход запрашаюцца ўрачы, артысты, мастакі, пісьменнікі, аграномы, інжынерна-тэхнічныя работнікі.

Аддзел прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

* * *

23 кастрычніка, у 8 гадзін вечара, у памяшканні педагагічнага інстытута адбудзецца агульнагарадскі сход комсамольскага актыва па пытанню аб выніках XIV з'езда комсамола Беларусі. Дакладчык—сакратар абкома ЛКСМБ тав. Стрыжак.

Беластоцкі гарком ЛКСМБ.

Нам. адказнага рэдактара **Г. М. КУЗНЯЦОЎ.**

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—78. Тыраж—10.000 экз. Друкарня Беластокдрук.